Белорусская культура органично вплетается в культуру общеевропейскую. Костюм жителя города XIV в. Австрии практически мало чем отличался от одежды горожанина Великого Княжества Литовского того же времени. Об этом свидетельствуют археологические находки фрагментов тканей, кожаной обуви, вязаных изделий, ювелирных украшений, относящиеся к XIII - XIV вв., которые представлены, например, в экспозиции Витебского областного краеведческого музея. Поэтому здесь нет никакой измены патриотизму. Взглянуть глазами «другого» на «свою» историю – один из лучших приёмов культурного диалога в эпоху постмодернизма.

ЛИТЕРАТУРА

1. van Buren, Anne H and Wieck, Roger S. Illuminating Fashion: Dress in the Art of Medieval France and the Netherlands . The Morgan Library & Museum, New York, 2011.
2. URL: http://www.liveinternet.ru/users/nostalgia-n/post386239584 (Дата обращения :27.11.2017)
3. URL: http://sapiencia.ru/rekonstrukcii/odezhda/evolyutsiya-kostyuma-zapadnoj-evropy-xiii-xv-vekov (Дата обращения: 27.11.2017)
4. URL: http://www.chantberry.com (Дата обращения 14.02.2018)
5. URL: https://historyofeuropeanfashion.wordpress.com/category/medieval-1100-1450 (Дата обращения 11.02.2018)

УДК 398.3(476.5)

Навуч. В.С. Лемяшкевіч; навуч. М.С. Зубава
Навук. кір., выклад. Н. М. Лісіца
(Філіял БДТУ ПДЛК)

## «РЭЧЫ З СЭНСАМ. АБЯРЭГІ ВІЦЕБШЧЫНЫ»

Нашы продкі інакш успрымалі навакольны свет. Каб агарадзіць сябе ад розных бед, негатыўных дзеянняў – славяне прыдумалі аберагальныя сімвалы. Яны таксама аберагалі сваіх уладальнікаў ад нападкаў злосных духаў, чорнага вока, небяспекі, а ўзамен неслі ўдачу, дастатак і шчасце ва ўсіх справах. Нават вышыўка, абавязкова чырвонага колеру, у адзенні беларуса па каўняры, рукаве і па нізу рабілася не проста для ўпрыгожвання, яна аберагала ад дрэннага вока, сурокаў, злосных духаў.

Многія з'явы, якія адбываюцца ў жыцці і прыродзе, людзі і зараз растлумачыць не могуць і таму стараюцца аберагчы сябе, сваіх блізкіх, сям'ю, захаваць шчасце, дабрабыт, здароўе. Таму звяртаюцца да абярэгаў. Беларусы апошнім часам менш набываюць біжутэрыю і ўпрыгожванні без сэнсу, дораць падарункі проста так: яны стараюцца набыць або падарыць "рэчы з сэнсам", якія маюць засцерагальную сутнасць. Многія ювелірныя майстэрні Беларусі прапаноўваюць у продаж вырабы - абярэгі, якія зараз карыстаюцца вялікім попытам.

Абярэгі - своеасаблівая магічная фальклорная з'ява, фарміраванне якой адносіцца да глыбокай старажытнасці, перыяду язычніцтва. Яны настолькі моцна ўкараніліся ў жыццё як старажытных, так і сучасных людзей, што сталі цалкам натуральным яго элементам, падобна да тых патрэб чалавека, якія існуюць на падсвядомым узроўні.

Большасць абярэгаў накіравана на захаванне жыцця, здароўя, працаздольнасці чалавека. Менавіта ў іх перасякаюцца сферы ўяўлення, веравання і сімвалічнай рытуальнай дзейнасці чалавека. Другімі па колькасці і распрацаванасці пасля прысвечаных чалавеку былі абярэгі жывёл. Сярод іх аб'ектаў узгадваюцца толькі свойскія жывёлы і іх патомства як крыніцы харчавання, вырабу рэчаў і як працоўная сіла, наяўная і патэнцыйная. Асобную групу складаюць абярэгі, якія дапамагаюць пазбавіцца, абараніць ад хвароб або выконваюць прафілактычную функцыю. Да гэтай групы адносяцца лялькі, якія не маюць твару: лялька – пялянашка, лялька -траўніца.

У Віцебская вобласці быў знойдзены ўнікальны абярэг у выглядзе вадаплаўнай птушкі. Ён датуецца 12-13 стагоддзямі. Вадаплаўная птушка аб'ядноўвае ў сабе 3 стыхіі: паветра, зямлю і ваду. Лічыцца, што гэты абярэг дорыць здароўе і дае станоўчую энергію свайму ўладальніку, а таксама сімвалізуе плоднасць і працяг роду.

У народнай медыцыне беларусаў Падзвіння вялікая роля адводзіцца вадзе і "святым" крыніцам. Вада з крыніц лічыцца гаючай, бо "яна ад Бога свянцоная". Можна назваць крыніцы ля вёсак Чарневічы і Бабруйшчына (Глыбоцкі раён), Сарочына і Стайкі (Ушацкі раён) і многія іншыя. Вельмі распаўсюджаны на Падзвінні ачышчальныя і аздараўляльныя абрады з вадой на Святыя Каляды, Хрышчэнне, Вялікдзень, Купалле, Чысты чацвер. Напрыклад, на Каляды таму, хто хацеў быць крэпкім і чырвоным на працягу года, неабходна ўмывацца вадой, у якую апушчаны медныя або залатыя

грошы. А каб мець белы твар, у ваду трэбы апусціць срэбраную рэч або грошы. На Хрышчэнне вада мела вялікую сілу, бо той, хто акунецца ў палонцы 3 разы да ўсходу сонца, будзе крэпкі і здаровы. Вада, асвянцоная ў гэты дзень, валодае лекавай сілай пры вонкавых і ўнутраных захворваннях.

Значнае месца ў лекавай магіі надавалася агню. Вялікай сілай было надзелена купальскае вогнішча. Лічылася, што, каб ачысціць сябе, засцерагчы ад сурокаў, дзяўчаты і хлопцы скакалі праз купальскае вогнішча. Попел і вугаль таксама надзяляліся лекавымі ўласцівасцямі.

Асаблівыя магічныя ўласцівасці па народнаму ўяўленню сканцэнтраваны ў камянях незвычайнай формы і памераў, якіх на тэрыторыі Беларускага Падзвіння шмат. Некаторыя з іх мелі гаючую сілу. Як лекавыя ў адных выпадках выкарыстоўваліся кавалачкі каменя, які трэба было стаўчы ў парашок ("Шалёны камень" у вёсцы Грыдзюшкі, Глыбоцкага раёну), у іншых падыходзіла толькі дажджавая вада, узятая са "слядкоў" (камень - следавік ля в. Прудзіны, Бешанковіцкага раёну) ды іншыя.

Таксама магічная сіла існуе ў ручніка. Ручнік у беларусаў з’яўляецца магічнай рэччу. У яго арнаменце разглядаецца пэўная мадэль свету, якой доўгі час карысталіся папярэднікі. Кожны ўзор арнаменту мае пэўнае значэнне. Ручнік быў родавым абярэгам.Гэтае ахоўнае покрыва збірала пад сваю апеку ўвесь род.

Пояс – неабходная і абавязковая частка традыцыйнага беларускага адзення, якая надавала адзенню непаўторны выгляд. Лічылася, што пояс меў магічныя ўласцівасці: абараняе цела ад хвароб, а ўладальніка ад няшчасцяў, аберагае ад злога вока і сурокаў. Пояс сімвалізуе моц у мужчын і сімвал цнатлівасці для жанчын.

Павука ў сялянскіх сем’ях вывешвалі перад Новым годам на самым пачэсным месцы – у чырвоным куце. Строгая гармонія яго форм і руху былі заклікаы аберагаць хату і яе гаспадароў. Павук уцягваў у сваё павуцінне ўсё негатыўнае, усё тое, што магло перашкодзіць шчасліваму цячэнню жыцця сям’і. Кожны год паўтараўся цыкл: стары павук спальваўся і на яго месца вывешваўся новы.

З мэтай абароны сябе, сваіх родных, хатняй жывёлы ў дарозе выкарыстоўвалі абярэгі, магічныя дзеянні, замовы. Збіраючыся ў далёкую дарогу, з сабой бралі жменю роднай зямлі, якая павінна «сцерагчы, дапамагаць» у складаныя моманты. Калі набіралі зямлю,

прыгаворвалі: «Радзімая хата, радзімая зямля, зберагайце раба Божага (імя) на шляхах - дарогах». Падтрымку аказвала і самае важнае месца ў хаце – стол, які трэба перад дарогай тройчы пацалаваць. Вярнуўшыся з дарогі, трэба з удзячнасцю зноў пацалаваць стол. Тры разы абводзіў вакол стала па сонцы бацька маладых перад вянчаннем.

**Абярэгі на вяселле.** Галоўнымі атрыбутамі вяселля з'яўляюцца жыта, вясельны каравай. Дадатковую функцыю выконваў вясельны вэлюм, заручальныя пярсцёнкі, вянчальныя свечкі. Адзенне выконвала сімвалічную функцыю. Колер у ім пераважаў белы, але прысутнасць чырвонага колеру абавязковай, бо гэта колер жыцця, самы надзейны, самы распаўсюджаны абярэг. Пасля завяршэння выкупу нявесты, бацька абвязваў дачку ручніком і тройчы абводзіў яе вакол стала — сакральнага месца, за якім збіраецца сям'я. Прычым нявеста была абвязана белай часткай ручніка (яна «памірала» для гэтай сям'і, пераходзіла ў іншую), а бацька трымаўся за яго чырвоныя канцы: ён заставаўся тут. У час вянчання маладыя стаялі ў храме на белай частцы ручніка: «памiралі» ў статусе «хлопец і дзяўчына» і перанараджаліся ў «мужчыну і жанчыну». Калі маладыя выходзілі з хаты нявесты, бацькі рабілі каля парога арку з ручніка і двух боханаў хлеба. Утваралася «трыўмфальная» арка (брама, вясёлка, падкова на шчасце), з-пад якой павінны дачка - нявеста і будучы зяць накіравацца ў новае жыццё. Выходзячы з храма, хросны бацька ці маці жаніха ці нявесты звязваў маладым рукі поясам - абярэгам чырвонага колеру. Вясельны стол завяршаўся падзелам каравая, які пад усеагульнае благаславенне выносілі хросныя бацькі. Ручнік слалі так, каб каравай абавязкова знаходзіўся на яго чырвонай частцы.

**Радзінныя звычаі, абрады ў Полацкім раёне Віцебскай вобласці.** Шмат прыкмет было для цяжарнай жанчыны, каб вызначыць пол дзіця. Трэба былоназіраць, калі ў левым баку першы раз адчуюцца шавяленні дзіцяці, значыць народзіцца дзяўчынка, калі шавяленні справа —хлопец. Калі жанчына, каб устаць, выцягвае першай правую нагу — народзіцца хлопец, левую — дзяўчына. Многае забаранялася цяжарнай жанчыне, каб зберагчы дзіця, напрыклыад нельга глядзець на пажар, пераступаць праз вяроўку, тушыць нагамі галавешку, нельга глядзець на непрыгожых і скалечаных людзей, бо дзіця будзе такім і гэтак далей. Вельмі важным лічылася першае купанне: кідалі манетку ў ваду, маці сцэджвала крыху малака, каб крэпкі быў і не маглі сурочыць, дабаўлялі свянцонай вады, каб меў божую падтрымку. Не купалі дзіця ў

кіпячонай вадзе, бо казалі, што яно ўсё жыццё будзе неспакойным, «кіпець», злавацца.

**Студэнцкія абярэгі.** Але нідзе, бадай, так не распаўсюджаны абярэгі, як у студэнцкім асяродку. Самы напружаны час для студэнтаў – гэта экзаменацыйная сесія. У стане няўпэўненасці яны пачынаюць прыбягаць да абярэгаў і рытуалаў. Назавём некаторыя з іх. Каб выцягнуць пэўны білет, трэба, стоячы на правай назе, выцягваць левай рукой. Пра сябе сказаць: “Цягні, мая рука, што ведае мая галава”. Гаданні з мэтай даведацца, які білет выпадзе або якую атрымае адзнаку, можна выконваць у любы час. Мы прапануем некалькі варыянтаў вызначэнне будучай адзнакі: трэба скласці лічбы на нумары машыны, якую першую сустрэнеце раніцай, а таксама можна спытаць у цяжарнай жанчыны, якую сустрэнеце па дарозе.

**Неразлучнікі.**Народная лялька “Неразлучнікі”- падвесная вузельчыкавая лялька. Мы прапануем вашай увазе “Неразлучнікаў”, выкананых з нітак і саломы. Пры вырабе выкарыстаны натуральная тканіна і ніткі. Гэтыя лялькі сімвалізавалі аб’яднанне мужчынскага і жаночага пачатку ў адзінае непарыўнае цэлае. “Неразлучнікі” маюць адну агульную руку. Гэта рабілася для таго, каб муж і жонка ішлі па жыцці рука аб руку, паважалі адзін аднаго, разам неслі агульны груз праблем, і былі разам і ў радасці, і ў горы да канца жыцця. Лялька “Неразлучнікі” лічыцца сімвалам і абярэгам моцнага сямейнага саюза, “вузлом” сямейнай сувязі.

**Лялька – мотанка.** Зробленая сваімі рукамі, лялька - мотанка мае чароўную сілу. Яна не толькі захоўвае сямейны ачаг, але і валодае здольнасцю выконваць жаданні. Для вырабу лялькі-мотанкі неабходна: кавалачак белай тканіны для галавы, каляровыя шматкі тканіны для ручак, спадніцы і фартуха, кавалачак ваты, ніткі (ільняныя, шарсцяныя), ніткі мулінэ або трохкутнік клятчастай тканіны.

**Гліняная птушка – свістулька.**Свістулькі былі вядомыя яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Пачынаючы з паганскіх часоў, іх выкарыстоўвалі як магічны інструмент для заклікання ветру, дажджу ў летнюю спякоту, адпужвання злых духаў, заклікання вясны і сонечнага цяпла.

**Гліняны званочак.**Мініяцюрны званочак з гліны, распісаны акрылавымі фарбамі і падвешаны на шпагатны шнурок, мае здольнасць сваім звонам адганяць злыя сілы. З званочкаў складаліся

некаторыя музычныя інструменты, якія мелі рэлігійную функцыю. Яны служылі культавым мэтам і выкарыстоўваліся на святах для акампанементу.

**Саламяныя павукі.**Сабраныя з некалькі дзясяткаў саламяных трубачак у складаную прасторавую кампазіцыю, такія канструкцыі падвешваліся на ніткі ў самым ганаровым чырвоным куце, над сталом.

**Фенечкі.**Каб абараніць сябе ад сурокаў і дрэннага вока многія носяць на руцэ фенечкі абавязкова чырвонага колеру. На іх можа быць уплецены арнамент, які сімвалізуе здароўе, шчасце, дабрабыт, багацце.

**Заключэнне**

Спакон вякоў жыццё чалавека было насычана змаганнем з варожымі сіламі, увасобленымі ў хваробах, нападах драпежнікаў, небяспечных прыродных з'явах і г. д. Каб абараніць сябе і ўсё, што яму належала, чалавек выкарыстоўваў аберагальную магію, асноўнай мэтай якой было захаванне жыцця, здароўя, працаздольнасці, дзеля забеспячэння бесперапыннага існавання чалавека як біялагічнага віду.

ЛІТАРАТУРА

1. Народны эпас і міфологія.-Мінск, 2003.
2. Васілевіч У., Зайкоўскі Э. Абярэгі, кудмені, амулеты, атрапеі// Беларуская міфалогія:Энцыклапедычны слоўнік.-Мінск, 2004
3. Левкиевская Е.Е.Славянский оберег: семантыка и структура.-Москва, 2002
4. Корсак В. У. Міфасемантыка і функцыянальнасць беларускіх абярэгаў у кантэксце старажытнай міфалагічнай сістэмы: дыс.канд. філал.навук. Мінск, 2006
5. Никифоровский Н. Я.Простонародные приметы, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Витебск, 1897